НЕ ТРЫ РАДКІ… ПРА ЭЛІЗУ АЖЭШКА

ЭЛІЗУ АЖЭШКА
ЭЛІЗУ АЖЭШКА
ЭЛІЗУ АЖЭШКА
ЭЛІЗУ АЖЭШКА
ЭЛІЗУ АЖЭШКА
ЭЛІЗУ АЖЭШКА

Невялічкая біяграфія ў інтэрнэце — гэта ўсё, што мы ведаем пра вялікіх? У «Бярозцы» калісьці была рубрыка «Не тры радкі», якая з іншага боку адкрывала чытачам цікавых аўтараў. Ці можна звесці жыццё пісьменніка да месца нараджэння, яго альма-матар і даты смерці? Дакладна не! Вось і Эліза Ажэшка — не проста стваральніца «Нізін» і «Хама», а ключавая фігура літаратурнага рэалізму, чый творчы манумент выйшаў далёка за межы «жаночай прозы» свайго часу. Чаму яе спадчына вартая прачытання? Адказ — у дэталях, якія зазвычай застаюцца за межамі вікіпедыйных радкоў.

ЭЛІЗА АЖЭШКА
ЭЛІЗА АЖЭШКА
ЭЛІЗА АЖЭШКА
ЭЛІЗА АЖЭШКА
ЭЛІЗА АЖЭШКА
ЭЛІЗА АЖЭШКА
ЭЛІЗА АЖЭШКА
ЭЛІЗА АЖЭШКА
ЭЛІЗА АЖЭШКА

А ВЫ ВЕДАЛІ, ШТО ПІСЬМЕННІЦА...

... пісала сачыненні за сяброўак?

Яшчэ ў пансіёне Эліза пачала праяўляць літаратурны талент. Чытала ўсё запар: і хатняе, і рэкамендаванае, і пазанавучальнае. Пісаць дамашнія заданні на тэмы, якія прапаноўваў ім настаўнік, вельмі любіла. Аўтарка магла пісаць па некалькі тэкстаў за раз для сябе і сваіх сяброўак. «Гэта ішло да таго часу, пакуль уважлівы педагог не навучыўся адразу пазнаваць яе стыль і ход думак у сачыненнях сваіх нядбайных выхаванак», — падкрэслівае Валянціна Гапава ў сваёй кнізе «Эліза Ажэшка: жыццё і творчасць».

... мела даволі дзіўную гісторыю са шлюбам?

У 16 гадоў Эліза Ажэшка (тады яшчэ Паўлоўская) выйшла замуж за Пятра Ажэшку, які быў старэйшы за яе больш чым удвая. У сваіх мемуарах яна прызнавалася: «Я згадзілася б выйсці замуж за дрэва» — і выбрала яго амаль што наўздагад. Растлумачыць гэты ўчынак можна тым, што яна хацела як мага хутчэй збегчы з бацькоўскай хаты. Але шлюб быў нешчаслівым: пісьменніца не кахала Пятра, ды і ўвогуле ў іх не было паразумення. Мужчына не падтрымліваў захаплення вёскай, супольных тэм для размовы амаль не было. Пасля таго, як мужа саслалі ў Сібір, Эліза адмовілася ехаць за ім, а ўжо праз два гады пасля яго амністыі ініцыявала развод.

... усім сэрцам любіла беларускую тэматыку?

Яе раман «Над Нёманам» і аповесці «Нізіны», «Дзюрдзі» ды «Хам» — гэта не

проста гісторыі пра жыццё людзей, а жывыя партрэты беларускай вёскі XIX стагоддзя, дзе падзеі адбываюцца ў рэальных гродзенскіх вёсках (Грынкі, Сухая Даліна і інш.), а героі — тыя самыя сяляне, якіх яна бачыла на ўласныя вочы, з іх цяжкім лёсам, мудрасцю і непахіснай сілай духу, што робіць яе творы блізкімі і зразумелымі для беларускага чытача.

… у нейкі час тварыла дзеля барацьбы за жыццё?

Пасля разводу і страты маёнткаў Ажэшка апынулася без сродкаў існавання. Яе першае апавяданне «Малюнак з галодных гадоў» (1866) з'явілася, магчыма, дзякуючы гэтаму цяжкаму перыяду. Пазней яна прызнавалася, што пісала не толькі праз творчую патрэбу, але і каб зарабіць на хлеб.

… развіла тэму фемінізму ў славянскай прасторы?

Ажэшка была адной з першых у тагачаснай літаратурнай суполцы, хто адкрыта казаў пра жаночую эмансіпацыю. Яе артыкул «Некалькі слоў аб жанчынах» (1870) і раман «Марта» (1873) раскрываюць цяжкі лёс жанчын, якія спрабуюць знайсці працу і незалежнасць у свеце, дзе іх лічылі толькі жонкамі і маці.

… была двойчы намінанткай узнагароды Нобеля?

У 1905 і 1909 гадах Ажэшка была намінавана на Нобелеўскую прэмію па літаратуры — але так і не атрымала яе. Затое ў 1906 годзе яна стала лаўрэаткай прэміі імя Ф. Кохмана за ўнёсак у літаратуру.

… была «Каралевай жывога слова»?

Францішак Багушэвіч называў аўтарку так за яе здольнасць пісаць пра складаныя рэчы простым і эмацыйным стылем. Яе творы лёгка чытаюцца і зразумелыя сучаснаму чытачу, нягледзячы на глыбіню тэм.

… мела эка-хобі?

Эліза Ажэшка не толькі пісала літаратурныя творы, але і цікавілася прыродай Гродзеншчыны. Яна даследавала і апісала каля 300 відаў мясцовых раслін, стварыўшы ўнікальную калекцыю з больш чым 228 гербарыяў. Іх можна пабачыць у Гродне, у аптэцы-музеі каля Фарнага касцёла. Дзякуючы стараннай кансервацыі расліны захаваліся выдатна.

… была ўлюбёнкай жыхароў Гродна (і не толькі)?

Калі Эліза Ажэшка ў 1910 годзе памерла, на яе пахаванне ў Гродне сабралася каля 15 тысяч чалавек. Улады нават адправілі 88 паліцэйскіх і конную варту, але гараджане самі падтрымлівалі парадак. Першы помнік пісьменніцы з'явіўся ў 1929 годзе, але падчас вайны яго знішчылі акупанты. Паводле легенды, помнік быў схаваны на могілках, а ў 1949 годзе ён зноў заняў месца ў горадзе — цяпер ён стаіць недалёка ад музея пісьменніцы.

Эліза Ажэшка — гэта не толькі класік беларускай літаратуры, але і феміністка, пісьменніца, якая жыла напоперак стэрэатыпам свайго часу. Для пачатку раю прачытаць яе твор «Хам», а далей, калі зацікавіцеся, — і іншыя тэксты. Яны вартыя вашай увагі!

Ганна БЕЛАЯ